# Ад вытокаў да сучаснасці: керамічны посуд з агоўскімі матывамі

**У. І. Панамароў,**
педагогі дадатковай адукацыі
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Жлобінскага раённага цэнтра
Творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка»
**Н. Р. Панасюк,**
педагогі дадатковай дукацыі
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
Жлобінскага раённага цэнтра
Творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка»

## Уводзіны

Традыцыйная культура заўсёды адлюстроўвала светапогляд народа, яго грамадскія каштоўнасці. Часам здаецца, што людзьмі забыта значна больш, чым засталося адкрыць, і таму чалавецтва ўсё мацней і мацней цягнецца да свайго мінулага. Рымары, каўпачнікі, кушняры, залатнікі – гэтыя прафесіі цяпер існуюць толькі ў кнігах, фільмах, на малюнках і яшчэ ў слоўніках. І такіх прафесій дзясяткі, а па свеце і сотні.

Калі ўглыбіцца ў карані гісторыі і ўспомніць, якую важную ролю ў станаўленні чалавецтва адыграла ганчарная справа, якой павагай і пашанай карысталіся людзі, якія ў дасканаласці валодалі гэтым нялёгкім, але жыццёва неабходным рамяством. Становіцца зразумела, што і мы не павінны забываць традыцыі нашых продкаў, мы павінны зберагаць і перадаваць будучым пакаленням тысячагадовыя веды нашай гістарычнай спадчыны. Быць звязуючым звяном паміж мінулым і будучым. Выхоўваць у навучэнцаў павагу і інтарэс да свайго мінулага, да традыцый сваіх прадзедаў. Берагчы іх і памнажаць.

Ганчарная вытворчасць дасягнула максімальнага росквіту ў канцы IX стагоддзя, але далей намеціўся глыбокі спад, як на тэрыторыі Беларусі, так і ва ўсім свеце. Гэта было звязана з бурным развіццём індустрыі ў многіх краінах. Вытворчасцю посуду зараз займаліся фабрыкі і заводы, вырабляючы мільённымі экзэмплярамі чашкі, міскі, вазы. Гэта рабіла ручную працу ганчароў неканкурэнтназдольнай. Ганчары закрывалі свае майстэрні, як і іншыя рамесленікі, і ўсё больш выбіралі працу на прамысловых прадпрыемствах. Так, з часам, да канца XX стагоддзя традыцыйны ганчарны промысел і наогул пераўтварыўся ў экзотыку, а ганчарныя вырабы цяпер усе больш выкарыстоўваліся як сувеніры альбо прадметы ўпрыгожвання інтэр’ера.

Народны мастацкі роспіс на Беларусі распаўсюджаны не так шырока, як кераміка. Але ўжо каля 6 тысяч год назад на керамічных вырабах з’яўляліся ўзоры і арнамент. Талеркі, кружкі ўпрыгожвалі магічнымі кругамі, цікавымі лініямі, таямнічымі ўзорамі. Выявы людзей, жывёл і раслін таксама можна было убачыць на знойдзеных керамічных прадметах у час раскопак.

Роспіс быў тэматычны. Калі, напрыклад, керамічны посуд прызначаўся для садавіны, на ім умелец маляваў садавіну. Лічылася, што дзякуючы роспісу актыўна развівалася выяўленчае мастацтва ў цэлым.

Агоўскі роспіс – незаслужана забытае народнае рамяство, але ў апошнія некалькі год атрымала “новае дыханне”.

Таму, прадметам даследвання стала вывучэнне ганчарнага промыслу нашай краіны, асаблівасцей беларускага роспісу і развіццё гэтых традыцый у наш час.

**Мэта праекта:** выраб набору керамічнага посуду на ганчарным крузе і роспіс у беларускіх традыцыях.

**Задачы:**

❒ пазнаёміцца з гісторыяй беларускай керамікі і ганчарнага промыслу; асаблівасцямі агоўскага роспісу;

❒ вывучыць тэхналогію вырабу традыцыйных відаў посуду з дапамогай ганчарнага круга і вырабіць іх, захоўваючы традыцыі;

- ❒ вывучыць тэхніку беларускага роспісу і распісаць керамічны посуд, захоўваючы традыцыі.

Праца над праектам была падзелена на некалькі этапаў.

Падрыхтоўчы этап: збор інфармацыі, падрыхтоўка метадычнай літаратуры па тэме праекта, складанне перспектыўнага плана праектнай дзейнасці.

Даследчы этап: вывучэнне тэхналогіі і апрацоўкі вырабаў з гліны асаблівасцей беларускага роспісу.

Практычны этап: рэалізацыя прадуктыўнай дзейнасці: выраб керамічнага посуду пры дапамозе ганчарнага круга і роспіс беларускім арнаментам.

Заключны этап: аналіз вынікаў праекта, абагульненне вопыту па тэме праекта, падрыхтоўка і прадстаўленне прэзентацыі.

Праект выконваўся на працягу 3 месяцаў. Заняткі праводзіліся па 3 разы на тыдзень па 2 гадзіны.

Ганчарная справа – гэта адзін са старажытнейшых відаў дзейнасці чалавека.

Неад’емным элементам у ганчарнай справе з’яўляецца непасрэдна сам ганчарны круг. Вынаходніцтва ганчарнага круга выклікала сапраўдны фурор у ганчарнай справе. З яго дапамогай можна было шматразова паскорыць і акультурыць вытворчасць гліняных вырабаў: посуд выходзіў з-пад рук ганчара больш тонкі і роўны.

Гэта была сапраўдная рэвалюцыя ў развіцці вытворчасці керамікі. У странах Індыі, Егіпта і Месапатаміі сляды наяўнасці ганчарнага круга археолагі прыпісваюць к 3-4 тысячагоддзю да нашай эры, у Кітаі і Старажытнай Грэцыі – тысячу гадамі пазней. У Паўночную Еўропу і Расію гэта вынаходніцтва прыйшло толькі ў эпоху Сярэднявечча. Характэрна, што з вынаходніцтвам ганчарнага круга рамяство з пераважна жаночага пераўтварылася ў мужское, так як пры кручэнні цяжкага круга патрабавалася нядзюжая мужчынская моц.

З часу з’яўлення ганчарнага круга і да сучасных мадэлей ён прайшоў тры асноўныя этапы станаўлення. Гэта: ручны круг, круг з ножным прывадам (кручэнне круга адбывалася пры дапамозе ног, якія верцяць цяжкі махавік,

замацаваны знізу станка). Ну а пасля вынаходніцтва электрарухавіка, ён стаў электрамеханічным. На сённяшні дзень гэта самы распаўсюджаны від ганчарнага круга, але ручныя і з нажным прывадам рэдка, але сустракаюцца.

Добра развітая ганчарная вытворчасць была раней і ў Беларусі. Ганчары былі ў кожнай вёсцы. Увесь посуд у хаце вырабляўся імі на самадзельных, драўляных ганчарных кругах, якія раскручвалі нагамі. З-пад рук майстроў выходзілі не толькі кружкі, міскі, але і шмат рознай іншай утвары. Гэта гарлачы, кубышкі, макітры, кветкавыя кашпо, рукамойнікі і нават гарлачы- календары.

Ганчарныя вырабы выкарыстоўваліся таксама і ў якасці медыцынскага абсталявання. У ход ішоў розны гліняны посуд. У адным посудзе гатавалі зёлкі, у іншым захоўвалі сушаныя травы і карэнне. А самыя маленькія збанкі, якія за свае невялікія памеры называліся махоткамі, выкарыстоўваліся пры прастудах у якасці медыцынскіх банак. Таксама па заказах лекараў ганчары выраблялі спецыяльныя медыцынскія грэлкі ў выглядзе нізкага посуду з плоскім дном і вузкім горлачкам.

Сталовы посуд беларускія ганчары распісвалі спецыяльнымі керамічнымі фарбамі альбо ангобамі (жыдкімі каляровымі глінамі), пакрывалі шклопадобнай палівай – глазурай. Асабліва шмат выраблялася чарналашчанага посуду.

Набыўшы ганчарны круг, навучэнцы гуртка “Арыбал” вырашылі вырабіць набор керамічнага посуду з яго дапамогай,  захоўваючы традыцыі беларускага ганчарнага промыслу.

Перш чым прыступіць да работы на ганчарным крузе неабходна распрацаваць эскізы: талеркі вялікай (мал.1), міскі маленькай глыбокай (мал.2), кружкі (мал.3), гарлача (мал.4).



Мал.1.



Мал.2.





Мал.3. Мал.4

Далей неабходна падрыхтаваць ком гліны. Дасканальна яго перамяць і перабіць, каб як мага лепей пазбавіцца ад паветра і камячкоў. Не павінна заставацца ні адной паветранай кішэнькі, а таксама каменьчыкаў і цвёрдых камячкоў гліны.

Для вырабу любога ганчарнага посуду існуе адпаведная паслядоўнасць.

**Этапы вырабу посуду на ганчарным крузе**

**1 этап.** Дыск ганчарнага круга злёгку змачваем вадой. Падрыхтоўваем неабходныя інструменты.





**2 этап.** Падрыхтаваны ком гліны замацоўваем на крузе. Уключаем станок і выстаўляем аптымальную хуткасць кручэння. Адбываецца цэнтроўка кома гліны на крузе.








**3 этап.** У цэнтры ацэнтраванай гліны вялікімі пальцамі праціскаем адтуліну.

Неабходна звяртаць увагу на глыбіню праціснутай варонкі, каб не прадавіць дзірку ў донцы. Таксама неабходна як мага больш змачваць вадой рукі і гліну, каб не разбаўтаць ком і не збіць цэнтроўку.





**4 этап.** Раздвігаем атрыманую адтуліну, фармуючы гліняны тор і выраўніваем донца цыклем. Таўшчыня донца павінна быць 5-6 міліметраў. Патрэбны дыяметр лепш кантраляваць кронцыркулем, каб атрымаць выраб заданага памеру.





**5 этап.** Выцягваем цыліндр. Сценкі цыліндра павінны быць раўнамернай таўшчыні знізу да верху і толькі на самым версе неабходна зрабіць патаўшчэнне.





**6 этап.** Надаем выцягнутаму цыліндру форму задуманага посуду. Спачатку пашыраем сценкі знутры, потым завужаем, дзе неабходна. На рыльцы фармуем венцік.





**7 этап.** Сценкі посуду загладжваем шналлю на дыску, які верціцца з невялікай хуткасцю.




Гатовы посуд: талерку вялікую, дзве маленькія глыбокія міскі, дзве кружкі і гарлач ставім на паліцу да поўнага высыхання (мал.1), а потым адпраўляем  абпальваць у печ (мал.2).




Мал.1 Мал.2

Пасля абпальвання посуд набывае характэрны для керамікі тэракотавы колер (мал.3).





Мал.3

**Роспіс набору глінянага посуду**

Гатовы гліняны посуд вырашылі распісаць у традыцыях беларускага народнага роспісу.

Беларускі роспіс – адносна малады від народнага мастацтва, які з’явіўся ў другой палове 19 стагоддзя. Роспісам займаліся як мастакі-прафесіяналы, так і народныя ўмельцы. Роспіс дзеліцца на 2 групы: арнаментальныя (геаметрычныя і прыродныя матывы) і сюжэтныя ( з адлюстраваннем міфічных, рэлігіёзных сюжэтаў, бытавых сцэнак, пейзажаў). У агоўскім роспісе выкарыстоўваліся кветкавыя матывы.

Кветкі, лісце, трава, гронкі ягад, птушкі, казуркі, чалавечыя фігуры – традыцыйныя матывы беларускага роспісу. Ім упрыгожвалі куфары, шафы, шкло, тканіну, а таксама керамічны посуд.

Агоўскі роспіс узнік у пасёлку Агова і блізляжачых сямі вёсках на паўдневым захадзе Беларусі. Гэта арнаментальны дэкор з выразным кветачным узорам матываў, які мае замкнёную кампазіцыю, без манернай надуманасці. Кветкі заўсёды малявалі ў абрамленні лісця – зверху ці знізу, з абодвух бакоў або ў вольным рытме.

Для таго, каб выканаць роспіс посуду неабходны наступныя матэрыялы: папера для эскіза, трафарэт, акрылавыя фарбы. А таксама інструменты: пэнздлік, аловак.

Набор посуду складаецца з 6 адзінак.

## Этапы роспісу

**1 этап.** Распрацоўка эскіза кампазіцыі ў адпаведнасці з размерам посуду на паперы.

Талерка вялікая.

Роспіс выкананы ў цэнтры посуду, а па краях- абводка (раслінны арнамент). У цэнтры тры вялікія фантастычныя кветкі ў абрамленні лісця, галінак з ягадамі і больш дробных кветак. Завяршае кампазіцыю абводка, якая складаецца з расліннага арнаменту, галінкі з лісцем і ягадамі. Колеры кантрасныя. Роспіс кветак, злучных матываў (больш дробных кветак, гронак ягад, галінак) мае плоскасцевы характар. Паміж кветкамі выконваецца інтэрвал.

У аснове пабудовы букета кветак- трохкутнік. Роспіс выконваецца пастозна, акуратна ўводзячы працоўны колер уздоўж пялесткаў і лісця. Пасля высыхання наносяцца дэкаратыўныя рыскі, ажыўкі, блікі.







Міска маленькая глыбокая.

Міска маленькая глыбокая – 2 адзінкі. У аснове кампазіцыі адна крупная кветка ў апраўленні лісця, кветак галінак з ягадамі. Па краю міскі- раслінны арнамент.





**Кружка**

Кружка – 2 адзінкі. Роспіс выконваецца з двух бакоў. У аснове кампазіцыі букет, які складаецца з крупнай кветкі, мелкай кветкі, лісткоў і галінак з ягадамі. Па краю, зверху і знізу раслінны арнамент.




**Гарлач**

Гарлач. Роспіс выконваецца з двух бакоў, як кружка.





**2 этап.** Роспіс эскіза посуду на паперы.

Колеры выбіраюцца кантрасныя. Роспіс кветак, злучных матываў (больш дробных кветак, гронак ягад, галінак) мае плоскасцевы характар. Паміж кветкамі выконваецца інтэрвал.

У аснове пабудовы букета кветак-трохкутнік.

Распрацоўваючы эскіз роспісу, неабходна улічваць законы кампазіцыі, падбіраць спалучэнне колераў, памятаць аб тым, што агоўскі роспіс- гэта завершаная, замкнутая кампазіцыя.









**3 этап.** Перанос эскіза на посуд з дапамогай трафарэта. Дамалёўка дробных элементаў.





 

**4 этап.** Роспіс посуду па эскізу. Выкананне дэкаратыўных штрыхоў, ажывак, блікаў.

 

 











Пасля заканчэння праекта была падрыхтавана прэзентацыя, у ходзе якой навучэнцы расказалі пра гісторыю ганчарнага промыслу, а таксама асаблівасцях беларускага роспісу.

## Заключэнне

Захаванне народнай культуры, народных традыцый мае у наш час вялікае значэнне для выхавання падрастаючага пакалення. Мы павінны ведаць сваю гісторыю і зберагаць усе лепшае, назапашанае тысячагоддзямі.

За час працы над праектам была вывучана гісторыя ганчарнага промысла на тэрыторыі Беларусі, асаблівасці "агоўскага роспісу", набыты навыкі работы на ганчарным крузе.

У ходзе рэалізацыі праекта быў выраблены набор керамічнага посуду на ганчарным крузе з шасці прадметаў: вялікая талерка, дзве маленькія глыбокія міскі, дзве кружкі, гарлач і выкананы іх роспіс у тэхніцы "агоўскага роспісу".

На працягу рэалізацыі праекта назіралася даследчая дзейнасць вучняў. Яны з цікавасцю вывучалі гісторыка-культурную спадчыну беларусаў, выконвалі практычную работу, удасканальваючы свае ўменні і навыкі.

Асваенне тэхналогіі вырабу керамічнага посуду на ганчарным крузе дазволіць працягнуць працу па вырабу розных відаў посуду, характэрных для беларускай керамікі і ўдасканаліць навыкі ў традыцыях беларускага роспісу.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Пачынава, Н.В. Беларускі народны дэкаратыўны роспіс. / Н.В.Пачынава. – Вышэйшая школа, 2005.
2. Пилар Наварро М. Пракическое руководство. Декорирование керамики. История. Основные техники. Изделия. Издательский дом "Ниола 21-й век", 2005.
3. Раманюк М.А. Сучасная кераміка Беларусі. Выяўленчае мастацтва. Беларусь./М.А.Раманюк-Мн.,1981.

4. Оговская роспись- народное творчество Беларуси. [ Электронный ресурс ]. – Рэжим доступа: https://veryimportantlot.com/ru/news/obchestvo-i-lyudi/tradicionnoe-iskusstvo-belarusi-ogovskaya-rospis. – Дата доступа: 05.01.2022.
5. Технология изготовлениияя глиняных изделий на гончарном круге. [ Электронный ресурс ]. – Рэжим доступа: http://patlah.ru/etm/etm-01/teh%20glina/goncar%20kryg/goncar%20kryg.htm. – Дата доступа: 05.01.2022.